3. Грищенко, И. А. Воспоминания гомельского протоиерея Петра Рылло (1884–1937) как исторический источник / И. А. Грищенко, А. В. Слесарев // прот. П. Рылло. Воспоминания. – Минск: Ковчег, 2023. – С. 7–26.

4. Навіцкі, У. Палітыка расколу Рускай праваслаўнай царквы ў Беларусі (1920-ыя гг.) / У. Навіцкі // Беларус. гіст. часоп. – 2003. – № 2. – С. 40–48.

5. Шкаровский, М. В. Русская Православная Церковь в XX веке / М. В. Шкаровский. – М.: Вече, Лепта, 2010. – 480 с.

6. Грищенко, И. А. Гомельский протоиерей Пётр Рылло (1884–1937) как свидетель эпохи / И. А. Грищенко // Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы : сб. науч. трудов / под общ. ред. В. В. Кириенко. – Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2021. – С. 41–43.

7. Хохлов, А. А. «Жила-была одна баба». Семейная драма священнической жены Людмилы Капитоновой (по материалам Государственного архива Республики Татарстан) / А. А. Хохлов // История: факты и символы. – 2023. – № 2. – С. 50–62.

***М. М. Мязга,***
*д-р гіст. навук, прафесар,*
*загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі,*
*ГДУ імя Ф. Скарыны*
*(г. Гомель, Рэспубліка Беларусь)*

# САВЕЦКАЯ МІЖВАЕННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ САВЕЦКА-ПОЛЬСКІХ АДНОСІН: МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ, ПАЛІТЫЧНАЯ КАН'ЮНКТУРА, ГІСТАРЫЧНЫ НАРАТЫЎ

У апошнія дзесяцігоддзі гістарычная навука перажывае значныя перамены, фарміраванне новых метадалагічных падыходаў, заязаных з выклікамі постмадэрнісцкага этапа развіцця навукі ў цэлым. Фарміруецца парадыгма навуковага даследавання, адным за сноўных пастулатаў якой з'яўляецца тэзіс аб адноснасці гістарычных ведаў. Набыло папулярнасць сцвярджэнне, згодна з якім гісторык фарміруе гісторыю мінулага ў сваёй творчай лабараторыі. Яшчэ адна тэндэнцыя ў развіцці сучаснай гістарычнай навукі – прыстасаванне гістарычнай

навукі да патрэб палітыкі, яе нацэленасць на абгрунтаванне палітычнага курса эліт той ці іншай краіны. Узрастанне залежнасці гістарычнай навукі ад палітыкі прывяло да фарміравання такога паняцця, як сацыяльна арыентаваная гістарыяграфія [1]. У яе рамках фактычна выконваецца пэўны палітычны заказ на гісторыяпісанне, а крытэрый навуковасці пры рэканструкцыі мінулага адыходзіць на другі план. Аднак, калі мы звернемся да гісторыі гістарычнай навукі, то ўбачым, што шэраг з пералічаных тэндэнцый, характэрных для сучаснага гісторыяпісання і яго прэзентацыі, не такія ўжо і новыя. Гісторыя заўсёды мела заказ па фарміраванню і замацаванню канкрэтных ведаў аб мінулым, якія задаюць пэўныя сацыяльна-палітычныя мэты і каштоўнасці. Разуменне гісторыі як навукі, якая цесна кантактуе з палітыкай, сфарміраваліся яшчэ ў XIX ст. Дастаткова ўспомніць работы Джона Сілі ці гісторыкаў Малагерманскай школы.

У поўнай меры разуменне гісторыі як навукі, якая непасрэдна звязана з палітыкай, а дакладней з класавай барацьбой, характэрна для савецкай гістарычнай навукі ўжо ў момант яе фарміравання ў 1920–1930-я гады. Самі назвы работ савецкіх гісторыкаў падкрэсліваюць гэтую сувязь. У якасці прыкладу можна прывесці працу беларускага даследчыка В. К. Шчарбакова, якая мела назву “Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі” [2]. Тут па сутнасці адзначаны і асноўны метадалагічны прынцып савецкай гістарыяграфіі – прыарытэт класавай барацьбы ў гістарычным мінулым, які, як бачым распаўсюджваўся і на гістарычную навуку. Лідар савецкай гістарычнай навукі на этапе яе станаўлення М. М. Пакроўскі адзначаў, што “сутнасць гісторыі ў тым, што гэта самая палітычная з усіх навук, і яе ўвязка тэорыі з практыкай заключаецца ў тым, што гісторыя павінна непасрэдна і нястомна тлумачыць масам адбываючуюся класавую барацьбу” [3, с. 5].

Праз прызму класавай барацьбы савецкая міжваенная гістарыяграфія даследавала і гісторыю міжнародных адносін, савецка-польскіх, у прыватнасці. Так, К. Радэк, тлумачачы прычыны польска-савецкай вайны яшчэ ў 1920 г. пісаў: “Зыходным пунктам палітыкі польскага ўрада ў адносінах да Расіі з'яўляецца жаданне вырваць з рук сялян, якіх вызваліла руская рэвалюцыя, землі і вярнуць іх буйным польскім памешчыкам.” [4, с. 165]. П. В. Суслаў і ў 1930-я гады пісаў пра інтарэсы “польскіх памешчыкаў, якія валодалі ў гэтых раёнах [Беларусь, Украіна – М. М.] да рэвалюцыі ўсімі буйнымі маёнткамі” як фактары пачатку Польшчай вайны супраць Савецкай Расіі [5, с. 19].

У сучасных умовах мы назіраем уцягванне ў гістарычныя даскусіі людзей, якія прафесійна гісторыяй не займаюцца, у прыватнасці, палітыкаў, публіцыстаў. І калі звярнуцца да гістарычных наратываў, створаных у 1920-я гады і прысвечаных савецка-польскім адносінам, то заўважым вылікі ўклад у іх напісанне палітычных дзеячаў. У прыватнасці, многія ацэнкі савецка-польскіх адносін, якія потым сталі базавымі для савецкай гістарыграфіі, былі закладзеныя У. І. Леніным. Ім была сфармулявана канцэпцыя, якая прадстаўляла вайну Польшчы супраць Савецкай Расіі як частку агульнага “белага” руху [6, с. 67]. Актыўна звярталіся да гісторыяпісання і іншыя савецкія палітычныя дзеячы. Як заўважае А. І. Алаторцава, у большасці сваёй палітыкі не валодалі неабходнай прафесійнай падрыхтоўкай, уносілі ў гістарычную навуку стыль і метады аўтарытарнага кіраўніцтва, укаранялі класавы падыход да вывучэння грамадскіх з’яў [7]. Пры гэтым імі часта ставілася задача ў найбольш спрыяльным святле паказаць сваю дзейнасць. Прыкладам можа служыць работа М. М. Тухачэўска. У ёй пералічваецца комплекс прычын, якія прывялі да паражанне Заходняга фронта пад яго камандаваннем у Варшаўскай бітвы, і пры гэтым ні слова не сказана аб праліках самога камандуючага [8, с. 72–73].

Яшчэ адзін фактар, які ўплывае на гістарычны наратыў – наяўнасць ці адсутнасць гістарычнай рэтраспектыва. Як адзначае расійскі даследчык Б. Г. Магільніцкі, храналагічная блізкасць даследчыка да аб’екта даследавання нараджае ілюзію простага рашэння, якое ляжыць на паверхні. Адсюль вынікаюць паспешныя, часцяком ідэалагізаваныя ацэнкі такіх падзей, якія не вытрымліваюць выпрабавання часам [9, с. 85]. Многія работы, прысвечаныя савецка-польскім адносінам, пісаліся савецкімі гісторыкамі міжваеннага часу літаральна адначасова з падзеямі, якія даследаваліся. Таму практычна немагчыма было ўбачыць падзею, а тым больш гістарычны працэс, у шырокім гістарычным кантэксце. Адсюль імклівыя пераходы ад адных інтэрпрытацый да супрацьлеглых. Так, у сярэдзіне – другой палове 1930-х гадоў савецкія даследчыкі ў якасці найбольш агрэсіўнай краіны, ад якой зыходзіць пагроза міру, называлі нацысцкую Германію. Пасля падпісання савецка-германскага дагавора аб ненападзенні сітуацыя змянілася. У. І. Пічэта ў сваіх даследаваннях робіць Польшчу краінай, якая развязала Другую сусветную вайну: “... польскія кіраўнікі пачалі вайну супраць Германіі” [10 , с.126]. І. Ф. Лочмель таксама абвінавачваў Польшчу ў развязванні вайны з Германіяй. Ён пісаў, што польскія кіраўнікі па ўказанні Англіі і Францыі ўвязаліся ў гэтую вайну [11, с.153].

Важнейшым прызнакам савецкай гістарыяграфіі стала, як адзначае сучасны расійскі даследчык А. М. Дуброўскі, наяўнасць гістарыяграфічных штампаў, якія грунтуюцца не на даследаванні крыніц, а на выкарыстанні выказванняў заснавальнікаў марксізму-ленінізму [12, с. 271]. Спасылкі на класікаў марксізму-ленінізму, на дзеючых палітыкаў, па сутнасці, павінны былі кампенсаваць недахоп гістарычных крыніц. Уплыў недахопу гістарычных крыніц на навуковы ўзровень гістарычнага наратыва трапна ахарактарызаваў беларускі даследчык В. І. Мянькоўскі: “Недахоп дадзеных непазбежна вёў да спрошчаных і абцякальных мадэляў, якія зводзяць складаныя і разнастайныя з'явы да стэрэатыпных адназначных паняццяў, спараджаюць спакусу даваць простыя і радыкальныя адказы на складаныя пытанні” [13, с. 43], як раз спасылаючыся на палітычныя аўтарытэты. Тыя ж даследчыкі, якія ў міжваенны час займаліся гісторыяй савецка-польскіх адносін, мелі доступ да вельмі абмежаванага кола крыніц, у асноўным да тых матэрыялаў, што з’яўляліся ў адкрытым друку [14].

Даследаванні па гісторыі савецка-польскіх адносін з’яўляюцца гістарыяграфічнымі крыніцамі. З пункту гледжання сучаснай гістарычнай навукі іх вывучэнне мы павінны пачынаць в высвятлення мэтаў, якія аўтар наратыва ставіў пры яго стварэнні. Па сутнасці перад савецкай гістарыяграфіяй стаяла задача даказаць віну Польшчы за развязванне савецка-польскай вайны ў 1919 г. і напружанасць у савецка-польскіх адносінах пасля Рыжскага міру. Так В. П. Друнін адзначаў, што польская дзяржава з моманту свайго аднаўлення ў 1918 г. заняла варожую пазіцыю ў адносінах да савецкай дзяржавы, усяляк імкнулася абвастрыць савецка-польскія адносіны [15, с. 182]. Пасля заключэння Рыжскага дагавора савецкія гісторыкі вырашалі задачу па стварэнні вобраза Польшчы як галоўнага патэнцыяльнага праціўніка ў ваенным канфлікце Савецкага Саюза з капіталістычным светам. Прыкладам можа служыць праца С. Я. Гесена, у якой акцэнт рабіўся на росце ваенных выдаткаў і захаванні ў мірны час вялікай па колькасці арміі Польшчы, што разглядалася аўтарам як сведчанне яе агрэсіўнасці [16, с. 24, 35]. Пры гэтым варожасць польскай палітыкі ў дачыненні да СССР зноў жа тлумачылася з класавых пазіцый. Так, В. П. Друнін падкрэсліваў, што ўсе жыццёвыя інтарэсы Польшчы патрабуюць падтрымання добрых адносін з Савецкай Расіяй, і толькі класавай нянавісцю яе кіруючых колаў тлумачыцца напружанасць у польска-савецкіх адносінах [15, с. 193, 194, 207].

Уплыў палітычнай кан’юнктуры на гістарыяграфію савецка-польскіх адносін добра ілюструе гістарычны наратыў, прысвечаны

Варшаўскай бітве. У 1920-я гады ва ўмовах існаваўшага ў РКП(Б) / УКП(б) пэўнага плюралізму гісторыкі, услед за У. І. Леніным, пісалі пра цяжкае паражэнне Чырвонай Арміі на берагах Віслы. Па меры ўсталявання ў партыі і дзяржаве аднаўладдзя І. В. Сталіна, які быў у 1920 г. непасрэдным удзельнікам баявых деянняў на польска-савецкім фронце, ацэнка вынікаў Варшаўскай бітвы карэнным чынам мяняецца. У 1935 г. Л. Ломаў так ацэнівае вынікі баёў на польска-савецкім фронце ў 1920 г.: "Разбіўшы войскі польскіх інтэрвентаў, савецкая дзяржава дамаглася вырашэння ўсіх асноўных задач" [17, с.13]. А ў працы "Фашысцкая Польшча ў тупіку" адзначалася, што Чырвоная Армія адкінула палякаў далёка ўглыб Польшчы, аж да Варшавы, і "ў выніку гэтага паражэння Польшча вымушана была падпісаць з Савецкай Расіяй мірны дагавор" [18, с. 10].

У 1920-я гады, калі паміж Савецкім Саюзам і Германіяй назіралася цеснае супрацоўніцтва ва ўмовах Рапала, у адпаведнасці з палітычнай кан'юнктурай, савецкая гістарыяграфія адзначала агрэсіўныя планы Польшчы не толькі ў дачыненні да СССР, але і да Германіі. Напрыклад, Л. Валынскі абвінавачваў Польшчу ў падрыхтоўцы агрэсіі супраць Германіі з мэтай захопу Данцыга і Усходняй Прусіі [19, с. 3–5]. Калі ж у пачатку 1930-х гадоў рапальская палітыка сутыкнулася з крызісам, то іншы савецкі аўтар М. Віслінскі пісаў аб правядзенні Польшчай антысавецкай палітыкі разам з Германіяй [20, с. 116–117, 121, 122].

Уплыў палітычнай кан'юнктуры на правядзенне гістарычных даследаванняў яскрава ілюструе вывучэнне савецкімі гісторыкамі месца Заходняй Беларусі ў савецка-польскіх адносінах. У канцы 1930-х гадоў у сувязі з рашэннем Камінтэрна аб роспуску Камуністычнай партыі Польшчы сталі з'яўляцца артыкулы савецкіх аўтараў, якія спрабавалі даказаць, што лозунг далучэння Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны да СССР ніколі не адлюстроўваў афіцыйнай пазіцыі савецкага кіраўніцтва. Яго з'яўленне ў КПП тлумачылася дзейнасцю ўнутры яе "правакатараў", якія выконвалі ўказанне польскай дэфензівы і імкнуліся "расстроіць зблiжэнне народаў, якія насяляюць Польшчу, з народамі вялікага СССР" [21, с. 93].

У сярэдзіне 1930-х гадоў адбываюцца карэнныя змены ў пазіцыі савецкага кіраўніцтва ў плане гістарычнай пераймальнасці паміж Расійскай імперыяй і Савецкім Саюзам. Быў адкінуты марксісцкі тэзіс пралетарскага інтэрнацыяналізму. Усё мацней гучыць тэзіс аб наяўнасці савецкага патрыятызму, у аснове якога рускі патрыятызм. 1 лютага 1936 г. у "Правде" быў апублікаваны перадавы артыкул, у якім гаварылася: "Усе народы – удзельнікі вялікай сацыялістычнай

будоўлі – могуць ганарыцца вынікамі сваёй працы.; усе яны ... паўнапраўныя савецкія патрыёты. І першым сярод роўных з'яўляецца рускі народ. ... Нянавісць да рускага ўключае ў сябе, вядома, нянавісць да ўсяго савецкага" [12, с. 57].

Гэтыя новыя ідэалагічныя палажэнні замацавалі змены ў савецкай знешняй палітыцы. І. В. Сталін адмаўляецца ад ідэі сусветнай рэвалюцыі і канцэнтруе намаганні на барацьбе з фашызмам, г. зн., перш за ўсё з Германіяй, што азначала шмат у чым вяртанне да традыцыйнай палітыцы царскай Расіі [22, с. 220–221]. У сувязі з канцэпцыяй пераемнасці, перад савецкай гістарыяграфіяй ставілася задача апраўдання знешняй палітыкі не толькі СССР, але і царскай Расіі. Гэта азначала нават пэўны паварот у метадалогі даследавання гісторыі міжнародных адносін ад класавага падыходу да падыходу, у аснове якога вылучэнне дзяржаўнага інтарэса ў якасці фактара, які вызначае змест знешняй палітыкі краіны. Ніжэй мы ўбачым, што гэты паварот не быў поўным.

У 1920-я гады, калі савецкія даследчыкі пісалі пра агрэсіўнасць Польшчы, яе саюзнікамі па антысавецкай палітыцы выступалі Францыя і Вялікабрытанія. Ператварэнне Германіі ў асноўнага праціўніка СССР прывяло да таго, што з сярэдзіны 1930-х гадоў ролю асноўнага партнёра Польшчы па падрыхтоўцы агрэсіі супраць СССР заняла Германія. Прыкладам можа служыць работа А. Врублеўскага. На думку аўтара, польская і германская экспансія на ўсход маюць гістарычныя карані, але ў новых умовах дадаецца яшчэ і класавая нянавісць да савецкай дзяржавы [23, с. 4, 162, 208–209]. Паварот у бок адстойвання перш за ўсё дзяржаўных расійскіх інтарэсаў яскрава праявіўся ў работах савецкіх аўтараў па гісторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны пасля іх уз'яднання з савецкімі рэспублікамі. Каб даказаць абгрунтаванасць уключэння названых тэрыторый у склад СССР, У. І. Пічэта пісаў, што "Заходняя Украіна... і Заходняя Беларусь... – гэта спрадвечна рускія землі, якія ўваходзілі ў імперыю Рурыкавічаў" [10, с. 3, 126]. Д. Мін імкнецца даказаць у сваёй працы, што Заходняя Украіна – гэта "спрадвечна руская зямля", якая з часоў Кіеўскай Русі вяла барацьбу супраць польскай агрэсіі [24, с. 4–5].

Такім чынам, савецкая міжваенная гістарыяграфія савецка-польскіх адносін развівалася як элемент агульнапалітычнай сітуацыі ў Савецкім Саюзе. Гэта прадвызначыла панаванне ў ёй адзінай марксісцкай метадалогіі, вялікі ўплыў палітычнай кан'юнктуры на гістарычныя даследаванні. Савецка-польскія адносіны разглядаліся пераважна з пазіцый канцэпцыі класавай барацьбы, што пазбаўляла пры іх вывучэнні сістэмнасці. Палітычная кан'юнктура вяла да частых змен

канцэптуальных палажэнняў гістарычнага наратыва як рэакцыі прыстасавання да палітычнага запыту. Адсутнасць доступу да крыніц і гістарычнай рэтраспектывы стваралі дадатковыя цяжкасці для атрымання навуковых гістарычных ведаў, аб’ектыўнай рэканструкцыі мінулага. У сілу пералічаных акалічнасцей мы маем падставы даследаванні савецкай міжваеннай гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін аднесці не да строга навуковага гістарычнага наратыва, а да работ, якія адпавядаюць ужываючамуся ў сённяшняй гістарычнай навуцы паняццю сацыяльна-арыенатваны гістарычны наратыў.

## Список источников и литературы

1. Белозорович, В. А. Формирование и развитие концепции истории Беларуси в отечественной историографии (конец XIX – начало XXI вв.) : Автореф. … докт. ист. наук / В. А. Белозорович. – Минск, 2023. – 50 с.

2. Шчарбакоў, В. К. Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі / В. К. Шчарбакоў. – Менск : Выдавецтва Беларускай акадэміі навук, 1934. – 104 с.

3. Покровский, М. Н. О задачах марксистской исторической науки в реконструктивный период / М. Н. Покровский // Историк-марксист. – 1931. – Т. 21. – С. 4–7.

4. Радек, К. Война польских белогвардейцев против Советской России / К. Радек. – М. : Госиздат, 1920. – 24 с.

5. Суслов, П. В. Политическое обеспечение советско-польской кампании 1920 года / П. В. Суслов. – М. – Л. : Гос. издат. Отдел воен. лит., 1930. – 174 с.

6. Ленин, В. И. Наше внешнее и внутреннее положение и задачи партии. Речь на беспартийной конференции рабочих и красноармейцев Краснопресненского района. 24 января 1920 года / В. И. Ленин // Полн. собр. соч. : в 55 т. – М. : Издат. полит. литерат., 1981. – Т. 40. – С. 67–71.

7. Алаторцева, А. И. Советская историческая наука на переломе 20–30-х годов / А. И. Алаторцева // История и сталинизм. – М. : Издат. полит. литературы, 1991. – С. 248–283.

8. Тухачевский, М. Поход за Вислу / М. Тухачевский // Поход за Вислу. Война 1920 г. / М. Тухачевский, Ю. Пилсудский. – М. : Новости, 1992. – С. 3–88.

9. Могильницкий Б. Г. История исторической мысли XX века; Курс лекций. Вып. II : Становление “новой исторической науки”. – Томск : Изд-во Том. ун-та, 2003. – 178 с.

10. Пичета, В. Основные моменты развития Западной Украины и Западной Белоруссии / В. Пичета. – М. – Л. : Гос. соц.-эконом. издат., 1940. – 136 с.

11. Лочмель, И. Ф. Очерки истории борьбы белорусского народа против польских панов / И. Ф. Лочмель. – М. – Л. : Гос. издат. Отдел воен. лит., 1940. – 163 с.

12. Дубровский, А. М. Власть и историческая мысль в СССР (1930–1950-е гг.) / А. М. Дубровский. – М. : Политическая энциклопедия, 2017. – 622 с.

13. Меньковский, В. И. История и историография: Советский Союз 1930-х годов в трудах англо-американских историков и политологов / В. И. Меньковский. – Минск : БГУ, 2007. – 359 с.

14. История дипломатии : в 3 т. / под редакцией В. П. Потемкина. – Москва ; Ленинград : Государственное издательство политической литературы, 1941–1945. – Т. 3. – 1945. – 883 с.

15. Друнин, В. П. Польша, Россия и СССР. Исторические очерки / В. П. Друнин. – М. – Л. : Госуд. издат., 1928. – 219 с.

16. Гессен, С. Я. Окраинные государства: Польша, Финляндия, Эстония, Латвия, Литва / С. Я. Гессен. – М. : Прибой, 1925. – 150 с.

17. Ломов, Л. Польша и ее армия / Л. Ломов. – М. : Гос. воен. издат., 1935. – 64 с.

18. Фашистская Польша в тупике. – Л. : Ленинградское областное издательство, 1938. – 68 с.

19. Волынский, Л. Антисоветский союз шести. Франция и ее союзники / Л. Волынский. – М. : Партиздат, 1932. – 40 с.

20. Вісляньскі, М. Замежная палітыка польскага фашызму / М. Вісляньскі // Полымя. – 1930. – № 3. – С. 112–123.

21. Свентицкий, Я. Провокаторы за работой (письмо из Варшавы) / Я. Свентицкий // Коммунистический Интернационал. – 1938. – № 1. – С. 92–94.

22. И. В. Сталин. Историческая идеология в СССР. – С.-Пт. : «Наука – Питер», 2006. – 494 с.

23. Врублевский, А. Польша / А. Врублевский. – М. : Гос. социально-экономическое издательство, 1936. – 212 с.

24. Мин, Д. Западная Украина / Д. Мин. – М. : Госполитиздат., 1939. – 48 с.